**Зайцава, Л.** Трэба быць заўжды мужчынам / Л. Зайцава // Герой працы (Шуміліна). — 2007. — 13 лют. — С. 2.

## ТРЭБА БЫЦЬ ЗАЎЖДЫ МУЖЧЫНАМ



Нягледзячы на аддаленасць часу, Афганістан баліць у параненай душы былых салдат, вярэдзіць цяжкімі ўспамінамі. Але гэтай вайне няма забыцця. Не забывае і былы камандзір узвода сапёрнай роты Мікалай Іосіфавіч Андрэеў глянуць 15 лютага на лісток календара і згадаць палеглых на чужыне сяброў, атуліць душэўнай цеплынёю жывых...

М. І. Андрэеў – ваеннаслужачы, прысвяціў ваеннай справе 27 гадоў свайго жыцця. Па абавязку службы часта прыходзілася пераязджаць з месца на месца, вернай спадарожніцай заўсёды была жонка – Галіна Сяргееўна. Колькі прыйшлося пераажыць жанчыне, калі ў лютым 1980 года мужа адправілі ў Афганістан, – перадаць немагчыма.

Мікалай Іосіфавіч ведаў, што едзе на вайну. Але ведаць – гэта адно, а паглядзець смерці ў твар і ўбачыць, як гінуць ці гараць у танку твае сябры, – гэта зусім іншае.

– Наш 24-ы танкавы полк, які ўзначальваў Міхаіл Фёдаравіч Казлоў (ён родам з Гомельшчыны), размясціўся ля пасёлка Шынданд. Мы абаранялі паўднёвыя рубяжы Радзімы, – згадвае М. І. Андрэеў.

Вядома, хапіла і бамбёжак, і абстрэлаў, і акружэнняў. З аднаго акружэння рота выходзіла трое сутак. Душманы з нянавісцю глядзелі на рускіх, часта рабілі засады. У кішлакі рускія маглі ўвайсці без перашкод, а вось назад іх не выпускалі, распачыналі страляніну.

– Раніцай міны дапамагалі знаходзіць спецыяльна абучаныя сабакі. А днём, калі пясок награваўся (тэмпература ў цяні даходзіла да плюс 45 градусаў), яны не маглі ўзяць след. Спецыяльным шчупам, метр за метрам прыходзілася абследаваць тэрыторыю.

Супрацьтанкавыя міны намацвалі з дапамогай кантактнага міннага трала. Наперадзе гэтай машыны знаходзіліся два каткі. Як трапяць на міны – ад узрыву галава гудзіць. Праз тры-чатыры месяцы механік-вадзіцель рабіўся інвалідам, – расказвае М. І. Андрэеў.

Быў і сам на валаску ад смерці, калі ледзь не ўзарваўся ля пасёлка Фарах: ступіў побач з месцам, дзе былі замаскіраваны дзве міны – супрацьтанкавая і супрацьпяхотная. Калі б на якія два сантыметры ўбок – усё б узляцела ў паветра.

Памятае Мікалай Іосіфавіч сваіх загінуўшых таварышаў: камандзіра танкавага батальёна Аляксандра Матусевіча з-пад Лепеля, камандзіра ўзвода Сяргея Памацілава з Курска... Машына доктара Сяргея Новікава з Новарасійска трапіла на міну. Пражыў салдат нядоўга...

Шмат прыйшлося пераажыць за два гады ў Афганістане – толькі ў жніўні 1982 года М. І. Андрэеў вярнуўся да ваеннай службы ў Клайпеду.

М. І. Андрэеў не згодны з тым, што вайна азлабляе чалавека і робіць бязлітасным.

Наадварот, той, хто прайшоў праз выпрабаванні, пачынае больш цаніць жыццё. Былы афганец не апраўдвае тых, хто апускае рукі, пачынае заглядваць у бутэльку. На яго думку, трэба заўсёды быць мужчынам і трымаць сябе ў руках.

**Л. Зайцава**